ЦБС г. Гродно

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка
імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу



# УЗРОСТ АКТЫЎНАЙ МУДРАСЦІ:

## вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах «3 Д: для дома, душы і вольнага часу» і «Званы госць»

Гродна, 2019

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# УЗРОСТ АКТЫЎНАЙ МУДРАСЦІ:

## вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах «3 Д: для дома, душы і вольнага часу» і «Званы госць»

Гродна, 2019

Узрост актыўнай мудрасці: вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах «3 Д: для дома, душы і вольнага часу» і «Званы госць» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. С. Рубель ; рэд. Н. Ю. Наземцава. – Гродна, 2019. – 16 с.

Выданне змяшчае інфармацыю пра лепшы вопыт работы па арганізацыі вольнага часу пажылых людзей у клубах па інтарэсах, якія дзейнічаюць пры бібліятэках № 2 і № 9 дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна».

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

# УЗРОСТ АКТЫЎНАЙ МУДРАСЦІ:

## вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах

Бібліятэчныя ўстановы на сучасным этапе выконваюць функцыі не толькі інфармацыйных цэнтраў, але і з’яўляюцца цэнтрамі вольнага часу і культурнага жыцця грамадства. Яны вельмі часта становяцца для карыстальнікаў месцам зносін, аб’ядноўваюць людзей, якія цікавяцца пэўнай тэмай або захоплены творчасцю.

Бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» вырашаюць шэраг пытанняў па арганізацыі вольнага часу розных сацыяльных і ўзроставых груп карыстальнікаў. Важная роля ў гэтым кірунку належыць клубам па інтарэсах, якія дзейнічаюць пры гарадскіх бібліятэках і карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў чытачоў.

Адной з самых актыўных катэгорый наведвальнікаў бібліятэк з’яўляюцца людзі сталага ўзросту. Вельмі часта людзі, якія выйшлі на пенсію, маюць павышаную патрэбу ў зносінах і імкнуцца яе рэалізаваць – актыўна ўключаюцца ў работу бібліятэчных аматарскіх аб’яднанняў.

Бібліятэкары, у сваю чаргу, клапоцяцца пра тое, каб пазбавіць пажылых людзей ад пачуцця адзіноты, аказаць ім маральную падтрымку, задаволіць іх патрэбы і інтарэсы. Цёплая сямейная атмасфера, што пануе ў гарадскіх бібліятэках дапамагае людзям старэйшага пакалення змагацца з існуючымі ў грамадстве стэрэатыпамі адносна старасці, адчуваць упэўненасць у заўтрашнім дні.

Наведванне бібліятэчных мерапрыемстваў, чытанне кніг і перыядычных выданняў упрыгожваюць жыццё сталых людзей, робяць яго годным і насычаным падзеямі.

З мэтай арганізацыі вольнага часу пажылых людзей пры бібліятэцы-філіяле № 2 працуе **клуб па інтарэсах «З Д: для дома, душы і вольнага часу (досуга)»**, а пры бібліятэцы-філіяле № 9 дзейнічае **клуб «Званы госць»**. Сябры гэтых аматарскіх аб'яднанняў – цікавыя людзі з багатым жыццёвым вопытам і вялікім запасам аптымізму. Таму і мерапрыемствы праводзяцца тут цікавыя і запамінальныя: сустрэчы з пісьменнікамі, гісторыкамі, музыкантамі, мастакамі, фатографамі, калекцыянерамі, урачамі, святарамі, прэзентацыі кніг, літаратурныя вечары, фальклорныя святы, вечары да Дня пажылога чалавека і інш.

Людзі старэйшага пакалення прыходзяць у бібліятэчныя клубы дзеля таго, каб сустрэцца з аднадумцамі, адысці ад штодзённых клопатаў і праблем, культурна і цікава адпачыць.

Члены клубаў не абмяжоўваюцца роляй гледачоў і слухачоў – яны выступаюць як арганізатары і актыўныя ўдзельнікі ўсіх мерапрыемстваў: рыхтуюць пытанні для сустрэч з пісьменнікамі, артыстамі, музыкантамі, чытаюць вершы, удзельнічаюць у прэзентацыях літаратуры і г.д.

Важнай часткай працы клубаў па інтарэсах з'яўляецца забеспячэнне максімальнага доступу да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. Кожнае пасяджэнне суправаджаецца знаёмствам з тэматычнымі выставамі, навінкамі літаратуры і аглядам перыядычных выданняў.

Аматарскія аб'яднанні пры бібліятэках працуюць у цесным кантакце з рознымі арганізацыямі і ўстановамі горада. Гэта: Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», ДУ «Гродзенскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі», ДУ «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна», ДУ «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна», Гродзенская епархія Беларускай праваслаўнай царквы і інш.

**Клуб па інтарэсах «З Д: для дома, душы і вольнага часу»** ў бібліятэцы № 2 пачаў дзейнічаць у 2015 годзе (кіраўнік – Лупач Галіна Вячаславаўна). Аб’яднанне налічвае 22 чалавекі. Штогод для іх адбываецца каля 10 рознабаковых мерапрыемстваў.



Падчас першых сустрэч у клубе высветлілі, што ўсе члены аб’яднання цікавяцца гродзенскай гісторыяй. Такім чынам на адным з пасяджэнняў яны адправіліся ў віртуальнае падарожжа «Вуліцы Гродна: мінулае і сучаснасць». Экскурсаводам стаў краязнаўца, аўтар больш 30-ці кніг па гісторыі Гродна В.Ю. Саяпін. Прысутныя здзейснілі вандроўку ў часе і прасторы па старэйшых вуліцах горада: Белуша, Антонава, Чырвонаармейскай, Захарава і інш.



**Сустрэча з В.Ю. Саяпіным**

У наступны раз у клубе сустрэліся з гісторыкам, краязнаўцай В.М. Чарапіцай, які распавёў пра невядомыя раней моманты беларускай гісторыі і гісторыі Гродна, пра даследаванні, прысвечаныя падзеям Айчыннай вайны 1812 года.



**Сустрэча з В.М. Чарапіцай**

Госцем краязнаўчай гадзіны «Зямлі маёй мінулы лёс» была экскурсавод, прадстаўнік турыстычнай фірмы «Мерапі» А. Цітова. Прысутныя даведаліся аб асноўных вехах гродзенскай гісторыі, пазнаёміліся з малавядомымі старонкамі жыцця Д. Гарадзенскага, А. Тызенгаўза, Я. Каханоўскага.

На адно з клубных пасяджэнняў быў запрошаны прафесар, доктар гістарычных навук В.В. Швед, які распавёў аб жыцці і дзейнасці, аб тым, як збіраў краязнаўчыя матэрыялы і знаходзіў сюжэты для сваіх твораў.

Да 125-годдзя з дня нараджэння знакамітага педагога-эколага, біёлага Яна Кахано́ўскага ў клубе правялі гадзіну гісторыі «І скрозь стагоддзі і пакаленні ён не стоміцца здзіўляць». Гісторык Д.П. Тарасюк распавёў прысутным пра заснаванне Гродзенскага заалагічнага парка і яго насельнікаў.



**Гадзіна гісторыі**
**да 125-годдзя Яна Кахано́ўскага**

Адметнай рысай дзейнасці клуба «З Д: для дома, душы і вольнага часу» з’яўляецца арганізацыя сустрэч з пісьменнікамі. Так, сябры клуба сустракаліся з вядомай паэтэсай Л.У. Шаўчэнка. Людміла Уладзіміраўна распавяла пра творчую дзейнасць і прадставіла кнігу «Вясёлая карусель», за якую ў 2015 годзе была ўдастоена прэміі імя А.І. Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Ладзілі бібліятэкары сустрэчу з паэтам, бардам, мастаком А.У. Апанасевічам, падчас якой аўтар чытаў свае творы, спяваў песні пад акампанемент гітары на вершы ўласнага сачынення і іншых аўтараў.



**Сустрэча з А.У. Апанасевічам**

На адно з мерапрыемстваў аб’яднання быў запрошаны паэт, празаік, парадыст П.Я. Сямінскі. Аўтар распавёў аб тым, што заахвоціла яго ўпершыню ўзяць пяро. Прачытаў свае творы, пародыі

на вершы іншых паэтаў. Завяршылася сустрэча жартоўнай варажбой па фразах з кніг пісьменніка.

Сустракаліся члены клуба з паэтэсай Л. Палеес (г. Мінск). Госця расказалала пра дзіцячыя і юнацкія гады, праведзеныя на Гродзеншчыне, падзялілася творчым вопытам, пазнаёміла прысутных са сваімі зборнікамі паэзіі, прачытала лепшыя лірычныя творы. Мерапрыемства суправаджалася песнямі на вершы аўтара.

Літаратурная гадзіна «Калі пішу – спадзяюся, веру і люблю» была прысвечана творчасці пісьменніцы, публіцыста Ліны Багданавай. Яна распавяла пра супрацоўніцтва з часопісам «Бярозка», прадставіла дзіцячыя кнігі, прачытала ўрыўкі з раманаў і склала жартоўны аповед з прапанаваных удзельнікамі мерапрыемства слоў.



**Сустрэча з Лінай Багданавай**

Пра духоўна-маральную культуру ішла размова на пасяджэнні «Не забываць за мітуснёй пра сэнс жыцця». Клірык Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора айцец Вячаслаў (Гаплічнік) распавёў пра духоўны і цялесны пост, пра спачуванне і боскія запаветы. Мерапрыемства суправаджалася аглядам выставы «Міласэрнасць на кніжнай паліцы».



**Сустрэча з айцом Вячаславам**

Падчас гадзіны духоўнасці «Вясновыя праваслаўныя святы» клірык Свята-Марфінскай царквы іерэй Аляксандр Гук гаварыў пра Вялікі пост, Звеставанне, Вербную нядзелю, пра традыцыі святкавання Вялікадня. Бібліятэкары прачыталі урыўкі з твораў

рускіх класікаў пра гэтыя святы, прапанавалі рэцэпты праваслаўных страў.

У наступную сустрэчу іерэй А. Гук распавёў пра гісторыю свята Вадохрышча, яго значэнне і традыцыі. Прысутныя даведаліся пра гаючыя ўласцівасці Вадохрышчанскай вады, і чаму ў гэты дзень яна становіцца святой.



**Сустрэча з іерэем А. Гукам**

Для ўдзельнікаў клуба ладзілі свята «Пад покрывам Прасвятой Багародзіцы». Іерэй Аляксандр Гук гаварыў аб ушанаванні Божай Маці ў праваслаўі, аб іконах Багародзіцы і аб святасці мацярынства. Завяршылася сустрэча праглядам фрагментаў з фільма А. Барыкіна «Заступніца».

Вельмі падабаюцца пажылым людзям мерапрыемствы з удзелам медыцынскіх спецыялістаў. Так, сябрам клуба быў прапанаваны вусны часопіс «Прыгажосць і здароўе». Ад бібліятэкараў яны даведаліся пра першыя касметычныя сродкі, пра тое, як змяняліся стандарты прыгажосці ў розныя эпохі. Урач-валеолаг аддзела грамадскага здароўя Гродзенскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі М.К. Ермаловіч распавяла пра правільнае харчаванне і фізічныя нагрузкі.

У наступны раз падчас гадзіны інфармацыі «І доўгі будзе хай ваш век» валеолаг Ермаловіч М.К. гаварыла пра асноўныя складаемыя здаровага ладу жыцця, пра масаж як сродак прафілактыкі захворванняў.

На пасяджэнні на тэму «Лекавыя расліны вакол нас» урач-нутрыцыёлаг В.Д. Абухава распавяла пра гаючыя ўласцівасці траў, вітаміны, якія ўваходзяць у іх склад, растлумачыла, як правільна збіраць і сушыць расліны, а кансультант некамерцыйнага партнёрства «Здароўе» В.Р. Разумава прадставіла розныя віды

біялагічна актыўных дабавак і распавяла, пры якіх захворваннях яны будуць карысныя пажылым людзям.

Гадзіна здароўя «У гармоніі з узростам» прайшла з удзелам урача-герантапсіхіятра Гродзенскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» А.С. Руцкога і псіхолага аддзела грамадскага здароўя Гродзенскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Н.Р. Шаманковой. Герантапсіхіятр распавёў пра прыкметы старэння арганізма і метады, якія дазваляюць зберагчы здароўе, пазнаёміў з правіламі харчавання і комплексам практыкаванняў для падтрымання добрага стану. Пры дапамозе псіхолага даведаліся, як сталым людзям супрацьстаяць стрэсам.



**Гадзіна здароўя**
**«У гармоніі з узростам»**

Падчас гадзіны цікавых паведамленняў «Ствара́й сваё здароўе сам» бібліятэкары пазнаёмілі членаў клуба з традыцыйнымі і народнымі метадамі ачышчэння арганізма. Прадстаўнік кампаніі «Нуга Бест» Л.В. Сарасек распавяла пра ўласцівасці і тэрапеўтычнае дзеянне, паказанні да ўжывання розных медыцынскіх вырабаў. З дапамогай электроннай прэзентацыі і відэаролікаў паказала прынцыпы дзеяння масажнага і лячэбнага абсталявання.

Адбываліся ў клубе і іншыя сустрэчы з цікавымі людзьмі. На адным з пасяджэнняў калекцыянер А. Вішнякова падзялілася «таямніцамі і легендамі старажытных калекцый». Яна распавяла пра гісторыю французскай і рускай парфумерыі, прадэманстравала флаконы, якім больш за дзвесце гадоў. Завяршылася мерапрыемства праглядам відэароліка «Загадкавыя артэфакты старажытнасці».

Сустракаліся члены клуба з астролагам Т.А. Аўдзеевай, кіраўніком авестыйскай школы астралогіі, якая дала характарыстыку кожнаму знаку Задыяка, прывяла прыклады з гараскопаў знакамітых

людзей, прадставіла астралагічныя прагнозы, адказала на шматлікія пытанні аб выхаванні дзяцей і асабістым жыцці.

У «Свет прыгажосці і гармоніі» сябры клуба акунуліся разам з паэтам, ювелірам, фатографам І.В. Субоціным. Ігар Віктаравіч падзяліўся вопытам арганізацыі літаратурнага кафэ «Тры свечкі», расказаў пра ўдзел у фестывалях бардаўскай песні, прадставіў свае кнігі і прачытаў лірычныя вершы.



**Сустрэча з І.В. Субоціным**



**Супрацоўнікі АСБ «Беларусбанк» на пасяджэнні клуба**

Для пажылых людзей была арганізавана сустрэча з прадстаўнікамі Беларусбанка, натарыята і Гродзенскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Служачы банка А.Г. Мікуліч распавёў пра ўклады для пенсіянераў, пра банкаўскія накапляльныя карткі, умовы і магчымасці крэдытавання. Натарыус І.А. Кірко растлумачыла, як выкарыстоўваць чэкі маёмасці і афарміць дарчую, запрасіла на бясплатную юрыдычную кансультацыю. Урач-валеолаг І.В. Копач пазнаёміла прысутных з эпідэміялагічнай сітуацыяй у Гродне, падзялілася рэцэптамі даўгалецця і здароўя. Псіхолаг Н.Р. Шаманкова распавяла пра тое, як пераадольваць стрэсавыя сітуацыі.



**Выступ псіхолага Н.Р. Шаманковай**

На вечар-сустрэчу «Не можа сэрца жыць спакоем» былі запрошаныя пісьменніца І.В. Фамянкова, заслужаны трэнер па футболе В.А. Сівакоў і суддзя нацыянальнай катэгорыі С.І. Бяззубаў. Ірына Васільеўна Фамянкова, якая стала лаўрэатам прэміі імя А.І. Дубко «Творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ў намінацыі «Пісьменнік 2018 года» распавяла пра творчыя планы, пра тое, як прыйшла ідэя стварэння серыі кніг пра зорак гродзенскага спорту, прадставіла сваю новую кнігу «Яго лёс – футбол». Працягнуў імпрэзу Вячаслаў Аркадзьевіч Сівакоў, які распавёў пра кар'еру футбаліста і трэнера. З цікавасцю сябры клуба слухалі аповед суддзі Сяргея Іванавіча Бяззубава пра ягоную спартыўную дзейнасць. На працягу мерапрыемства гучалі вершы ў выкананні вучняў сярэдняй школы № 11 Н. Міхальчык і В. Алёхіна.



**Вечар-сустрэча «Не можа сэрца жыць спакоем»**

Практыка паказала, што людзі старэйшага пакалення з задавальненем наведваюць пасяджэнні клуба па інтарэсах «З Д: для дома, душы і вольнага часу» і з нецярпеннем чакаюць новых цікавых сустрэч. Яны адносяцца да бібліятэкі як да свайго другога дома, а клуб прыносіць ім мноства дасягненняў.

***«На наш погляд, у жыхароў Гродна ёсць цудоўная магчымасць цікава і пазнавальна правесці вольны час, наведаўшы клуб у бібліятэцы»,*** – гавораць сябры клуба.

**Клуб па інтарэсах «Званы госць»** у бібліятэцы № 9 (кіраўнік – Арлова Таццяна Паўлаўна) быў створаны ў 2013 годзе ў межах бібліятэчнага абслугоўвання і сацыякультурнай рэабілітацыі ветэранаў. Аб’яднанне наведваюць 25 чалавек, для якіх штогод ладзяць каля 10 вечарын-сустрэч з цікавымі людзьмі горада.



**Званы госць – В.Ю. Саяпін**

Госцем аднаго з першых пасяджэнняў аб’яднання стаў вядомы краязнавец В.Ю. Саяпін, які раскрыў таямніцы старых гродзенскіх вуліц і распавёў пра тыя вуліцы, на якіх жывуць члены клуба, прадэманстраваў некалькі сваіх фільмаў з цыклу «Гродзенскі каляндар».

Пра ваенныя дзеянні ў гады Вялікай Айчыннай на тэрыторыі Гродзеншчыны, пра авіятараў, самалёты, воінскія часткі сябры клуба даведаліся падчас сустрэчы з гісторыкам, пісьменнікам Д. Кіенка. Акрамя таго, аўтар пазнаёміў прысутных з кнігамі «Крылы над Гродна», «Крылы над Нёманам», «Крылы над Лідай».



**Званы госць – Д. Кіенка**

Многія мерапрыемствы аб’яднання мелі літаратурны кірунак. Ладзілі ў клубе сустрэчу з паэтам, празаікам, аўтарам літаратурных пародый П.Я. Сямінскім. Прысутныя слухалі вершы і пароды, якія з артыстызмам чытаў госць. На развітанне Пётр Яраслававіч здзівіў складаннем бурымэ з прапанаваных слоў.

На адно з мерапрыемстваў была запрошана паэтэса А.Г. Чапукене. Алена Георгіеўна прадставіла новую кнігу «Восень жыцця мяне не засмучае», у якой яна ўзняла вечныя тэмы – каханне, вера, прыстойнасць. Прысутныя з задавальненнем паслухалі не толькі вершы ў выкананні аўтара, але і гісторыю іх напісання.



**Званы госць – А.Г. Чапукене**

Літаратурная гадзіна «Вольная птушка з Палесся» была прымеркавана да 70-гадоваму юбілею паэтэсы Яўгеніі Янішчыц. Гучалі ўспаміны беларускіх пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў. Вершы Я. Янішчыц чытала навучэнка Гродзенскага каледжа мастацтваў Д. Грыцкевіч. Завяршылася сустрэча віктарынай, якая выявіла знаўцаў паэзіі.

Літаратурна-музычная гасцёўня «Моим стихам … настанет свой черёд…» прысвячалася жыццю і творчасці Марыны Цвятаевай. Члены клуба пазнаёміліся з біяграфіяй і літаратурным партрэтам паэтэсы. Навучэнцы Гродзенскага каледжа мастацтваў выканалі песні і прачыталі вершы М. Цвятаевай.

Падчас літаратурнай вечарыны «Век серебряный, век из света, век поэзии, век мечты…» гаварылі пра перыяд росквіту рускай паэзіі. Удзельнікі імпрэзы не толькі дэкламавалі вершы сваіх любімых паэтаў, але і падзяліліся цікавымі фактамі з іх біяграфій.

Вечары духоўнасці ў клубе ладзілі з удзелам святароў. Так, члены аб’яднання сустракаліся з настаяцелем прыхода храма ў гонар Усекнавення галавы Іаана Прадцечы протаіерэем А. Жалезным і клірыкам храма В. Калацкім, якія распавялі пра царкоўныя запаветы, традыцыі, адказалі на пытанні пра тое, як рыхтавацца да споведзі і камуніі, як трэба пасціць. Закончылася сустрэча аглядам артыкулаў з кулінарнымі рэцэптамі папулярных часопісаў «Посцім смачна».

Карысную інфармацыю мелі магчымасць атрымаць члены клуба падчас сустрэч з урачамі.



Званы госць – С.Г. Фралова

«Давайце старэць павольней» – пад такім дэвізам прайшла сустрэча з урачом-валеолагам аддзела грамадскага здароўя Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі С.Г. Фраловай. Святлана Генадзьеўна распавяла, як затрымаць старэнне арганізма і зберагчы здароўе, дала рэкамендацыі, як прадухіліць сардэчныя захворванні. Увазе прысутных быў прадстаўлены агляд кніг і перыядычных выданняў, прысвечаных праблеме старэння.

Як правільна сябе паводзіць у складаных, стрэсавых сітуацыях членам клуба падчас гадзіны здароўя расказала псіхолаг Н.А. Аўсейчык, а бібліятэкары правялі вясёлы псіхалагічны тэст «Фрукты-ягады». За чаяваннем яны самі спрабавалі знайсці выйсце з розных сітуацый.



Званы госць – А.Г. Майсяёнак

«Дзе знайсці вітамін жыцця?» высвятлялі разам з вядомым у краіне спецыялістам па здаровым харчаванні і вітаміналогіі, доктарам біялагічных навук, прафесарам А.Г. Майсяёнкам. Андрэй Георгіевіч расказаў, якія патрэбны вітаміны пажылому чалавеку і колькі іх павінна быць у штодзённым рацыёне, ці можна замяніць садавіну і агародніну на аптэчныя прэпараты, ці могуць вітаміны нанесці шкоду і інш.

Атрымаць эстэтычную асалоду члены клуба мелі магчымасць падчас сустрэчы з мастаком, вучоным-фізікам, намеснікам дэкана па вучэбнай рабоце фізіка-тэхнічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Таркоўскім В.В. Вікенцій Вікенцьевіч расказаў пра сябе, сваю навуковую дзейнасць у галіне лазернай фізікі, пра захапленне пейзажным жывапісам. Некалькі прац аўтар прынёс з сабой. Завяршылася сустрэча пазнавальнай віктарынай «Пра мастацтва жартам і ўсур’ёз».



**Званы госць – В.В. Таркоўскі**



**Званы госць – І.В. Сотнікава**

На адно з пасяджэнняў была запрошана Сотнікава І.В., кіраўнік клуба «Гродзенская лялька» і стваральнік музейнага пакоя «Лялечны дом», што дзейнічаюць у бібліятэцы № 3. Іна Вісарыёнаўна пазнаёміла прысутных з экспанатамі музейнага пакоя, расказала пра розныя тэхнікі вырабу лялек і мяккіх цацак, пра майстрых-лялечніц, паказала іх працы, прадэманстравала прэзентацыю «Лялькі свету», правяла майстар-клас па вырабе лялькі-траўніцы.

Аднойчы госцем клуба быў вакальны ансамбль «Вясёлка», які дзейнічае пры Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна. Кіраўнік ансамбля Т.А. Кавалеўская пазнаёміла з гісторыяй стварэння самадзейнага калектыву, рэпертуарам, канцэртнай дзейнасцю. Да ўвагі слухачоў былі прадстаўлены рускія, беларускія народныя песні, а таксама песні савецкіх кампазітараў.

Штогод для прадстаўнікоў «залатога ўзросту» ў клубе «Званы госць» арганізуюць святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня пажылых людзей. Для іх ладзяць конкурсна-забаўляльныя праграмы, дораць музычныя віншаванні і памятныя падарункі. Тым больш што ні ў кожнага з іх ёсць тыя, хто ў гэта свята можа прыйсці і падарыць часцінку душы і ўвагі.

Адметнай рысай дзейнасці клуба з’яўляецца арганізацыя выязных мерапрыемстваў і экскурсій.

У Музеі гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы члены клуба наведалі выставу ікон і карцін з бурштыну гродзенскай майстрыхі Веранікі Біжака «Свет у бурштынавым колеры», на якой было прадстаўлена больш за 100 работ: іконы, партрэты, пейзажы і нацюрморты.



**Наведванне выставы «Свет у бурштынавым колеры»**



**У Народным мінералагічным музеі «Карат»**

Як з’яўляюцца, растуць, старэюць і паміраюць камяні, даведаліся члены клуба пабываўшы ў Народным мінералагічным музеі «Карат» сярэдняй школы № 16 г. Гродна. Удзельнікі экскурсіі паслухалі гісторыю стварэння музея камянёў. Юны экскурсавод Н. Юхно пазнаёміла прысутных з дзівосным светам мінералаў, горных парод і самацветаў, а таксама працамі вучняў студыі мастацкай апрацоўкі каменя.

У Гродзенскай выставачнай зале члены клуба наведалі выставу «35 гадоў з лялькай па жыцці», прымеркаваную да юбілею Гродзенскага абласнога тэатра лялек.

Яны ўбачылі больш за 100 унікальных лялек, дэкарацый, касцюмаў і эскізаў. Пазнаёміліся з фотаздымкамі, прысвечанымі гісторыі і сучаснасці лялечнага тэатра.



**На адкрыцці выставы «35 гадоў з лялькай па жыцці»**

Тэатралізаваную экскурсію «Марыя Апанасаўна запрашае...» ў Дом-музей Максіма Багдановіча члены клуба «Званы госць» прымеркавалі да 125-годдзя з дня нараджэння знакамітага беларускага паэта. Гасцінная гаспадыня падрабязна расказала пра сям'ю Багдановічаў і яе традыцыі, сыграла на клавесінах. Як госці гэтай сям'і ўдзельнікі экскурсіі пілі травяную гарбату і гулялі ў фанты. Пасля знаёміліся з экспанатамі музея.



**У Доме-музеі Максіма Багдановіча**

Пабывалі сябры клуба ў гасцях у гродзенскага гісторыка, краязнаўцы А.П. Госцева, заснавальніка Музея гісторыі педагогікі Гродзеншчыны XII–XXI стст. Алесь Пятровіч распавёў пра тое, як з'явілася ідэя стварэння музея, як збіраліся экспанаты для яго, а вучань і паслядоўнік знакамітага краязнаўцы Алесь Перагудаў правёў пазнавальную экскурсію.



**У Музеі гісторыі педагогікі Гродзеншчыны**

Адно з пасяджэнняў клуба адбылося ў сценах адкрытага акцыянернага таварыства «Малочны мір». Экскурсавод Д. Андрэйчык пазнаёміла ўдзельнікаў з гісторыяй прадпрыемства, яго структурай, асартыментам прадукцыі і тэхналагічнымі працэсамі вырабу прадуктаў.







**Экскурсія на ААТ «Малочны мір»**

***«Праца з пажылымі людзьмі – справа патрэбная, важная і вельмі актуальная. Трэба бачыць, з якім задавальненнем прыходзяць да нас пенсіянеры. Мы даём ім магчымасць зразумець, што жыццё працягваецца і пасля выхаду на пенсію, дапамагаем з карысцю і займальна правесці вольны час»,*** – робяць высновы бібліятэкары.

■ ■ ■

Супрацоўнікі бібліятэк № 2 і № 9, кіраўнікі клубаў па інтарэсах пастаянна знаходзяцца ў пошуку навацыйных форм работы, распрацоўваюць цікавыя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю кнігі і арганізацыю карыснага вольнага часу сваіх чытачоў. Яны робяць усё магчымае, каб карыстальнікам старэйшага пакалення было ўтульна і камфортна ў гарадскіх бібліятэках, імкнуцца акружыць іх увагай і душэўнай цеплынёй, падтрымаць пачуццё ўпэўненасці ў сабе і ва ўласнай значнасці.

# ЗМЕСТ

Узрост актыўнай мудрасці:
вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах __________ 1

Клуб па інтарэсах
«З Д: для дома, душы і вольнага часу» __________ 3

Клуб па інтарэсах «Званы госць» __________ 10

# УЗРОСТ АКТЫЎНАЙ МУДРАСЦІ:

**вольны час гараджан у бібліятэчных клубах па інтарэсах «3 Д: для дома, душы і вольнага часу» і «Званы госць»**

Складальнік А. С. Рубель

Рэдактар Н. Ю. Наземцава